© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

## РТ–2018/2019 гг. Этап I

## Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

## Варыянт 2

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:<br>1) возера (***С***)***віцязь***;<br>2) карэнны (***П***)***алачанін***;<br>3) птушка (***Г***)***рак***;<br>4) песня ***«***(***К***)***упалінка»***;<br>5) кветка (***Р***)***ужа***.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *возера* ***Свіцязь*** → назоўнік, які абазначае геаграфічную назву, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>2) *карэнны* ***палачанін*** → назоўнік, які ўказвае на месца пражывання, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>3) *птушка* ***грак*** → назоўнік, які абазначае назву птушкі, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>4) *песня* ***«Купалінка»*** → назоўнік, які абазначае назву музычнага твора, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>5) *кветка* ***ружа*** → назоўнік, які абазначае назву расліны, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Агульныя і ўласныя назоўнікі | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 18, 27 |
| **А2.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:<br>1) н_ванароджаны;<br>2) падагр_ваць;<br>3) орд_р;<br>4) др_жаць;<br>5) ж_луды.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *н**о**ванаро́джаны* → націск падае не на першы склад другой часткі складанага слова, таму ў першай яго частцы пішацца літара ***о***;<br>2) *падагр**а**ва́ць* → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [***э***] пераходзіць у гук [***а***], што і перадаецца на пісьме: *падагрэ́ць – падагр**а**ва́ць*;<br>3) *о́рд**а**р* → запазычанае слова, якое з'яўляецца агульнай назвай і ў якім канцавое спалучэнне -***эр*** не пад націскам перадаецца ў беларускай мове як -***ар***;<br>4) *др**ы**жа́ць* → спрадвечна беларускае слова, у | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

УВАГА!

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | якім націскны склад **ро** чаргуецца з ненаціскным **ры**: *др**о́**гкі – др**ы**жа́ць*;<br>5) ***жалуды́*** → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [**о**] пераходзіць у гук [**а**], што і перадаецца на пісьме: *ж**о́**луд – ж**а**луды́* | | вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А3.** Адзначце словы (прыклады), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:<br>1) жыцц_любства;<br>2) бал_рына;<br>3) дроб_зь;<br>4) в_сялосць;<br>5) б_з хлеба.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *жыцц**я**лю́бства* → складанае слова, у якім пішацца злучальная літара ***я***, бо націск падае на першы склад другой яго часткі;<br>2) *бал**е**ры́на* → запазычанае слова, у якім пішацца літара ***е*** незалежна ад месца націску;<br>3) *дро́б**я**зь* → спрадвечна беларускае слова, у суфіксе якога незалежна ад месца націску пішацца літара ***я***;<br>4) *в**е**сяло́сць* → спрадвечна беларускае слова, у якім не ў першым пераднаціскным складзе пішацца літара ***е***;<br>5) *б**е**з хле́ба* → прыназоўнік ***без*** заўсёды пішацца з літарай ***е*** | Фанетыка і арфаэпія.<br>Арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 35.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А4.** Адзначце словы (прыклады) з правільным напісаннем падкрэсленых літар:<br>1) кансілі**у**м;<br>2) кантрольна-**ў**ліковы;<br>3) са**у**на;<br>4) чаро**ў**ны;<br>5) вуліца **Ў**ральская.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *кансілі**ум*** → у запазычаным слове, якое заканчваецца на **-*ум***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>2) *кантрольна-**ў**ліковы* → пасля злучка, які не з'яўляецца знакам прыпынку, пішацца літара ***ў*** (нескладовае), бо папярэдняе слова заканчваецца на галосны;<br>3) *са́**ў**на* → пасля галоснага ў сярэдзіне запазычанага слова не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>4) *чаро**ў**ны* → слова, у якім адбылося чаргаванне зычных гукаў [**в**] і [**ў**]: *чара**в**аць – чаро**ў**ны*;<br>5) *вуліца **У**ральская* → у пачатку ўласнай назвы пішацца літара ***У*** (складовае) і пасля | Фанетыка і арфаэпія.<br>Арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс ***у–ў*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | галоснага | | |
| **А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) светлы;<br>2) медальён;<br>3) агеньчык;<br>4) стэпь;<br>5) чагосці.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *светлы* → пасля [**с’**] перад мяккім зычным [**в’**] *мяккі знак* не пішацца;<br>2) *медаль**ё**н* → пасля зычнага [**л’**] перад літарай **ё**, якая абазначае два гукі [**йо**], у запазычаным слове пішацца *раздзяляльны* **ь**;<br>3) *аген**ь**чык* → у назоўніку, утваральная аснова якога заканчваецца на **-нь** (*агонь*), перад памяншальна-ласкальным суфіксам **-чык-** пішацца *мяккі знак*;<br>4) *стэп* → пасля губнога зычнага гука [**п**] *мяккі знак* не пішацца;<br>5) *чаго**сьці*** → у постфіксе **-сьці** пішацца *мяккі знак* | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс мяккага знака і апострафа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 5, 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А6.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):<br>1) спіралью;<br>2) сугучча;<br>3) классіка;<br>4) зацверджанныя;<br>5) рассакрэціць.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *спіра**ллю*** → у назоўніку 3-га скланення ў форме творнага склону адзіночнага ліку падаўжэнне зычнага гука [**л’**] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (**лл**);<br>2) *сугу**чча*** → падаўжэнне зычнага гука [**ч**] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (**чч**);<br>3) *кла**с**іка* → у слове іншамоўнага паходжання падаўжэнне зычных гукаў не адбываецца і пішацца адна літара **с**;<br>4) *зацверджа**н**ыя* → у суфіксе **-ан-** дзеепрыметніка пішацца адна літара **н**;<br>5) *ра**сс**акрэціць* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (**сс**) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 9.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 19.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 29 |
| **А7.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) міласэрны;<br>2) хрышчоны;<br>3) постны;<br>4) перавошчык; | 1) *міласэ**рны*** → гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [**рдн**] вымаўляецца як [**рн**], што і перадаецца на пісьме;<br>2) *хры**шч**оны* → спалучэнне зычных гукаў [**с’ц’**] на канцы кораня слова чаргуецца з [**шч**], што | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Зычныя гукі. Іх | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 5) маладзьбіт.<br><br>**Адказ:** 1,2 | і перадаецца на пісьме: *хры**сц**іць* – *хры**шч**оны*;<br>3) *по**сн**ы* → гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [***стн***] вымаўляецца як [***сн***], што і перадаецца на пісьме;<br>4) *перавозчык* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***з***] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*п’эраво**шчы**к*]; правяраем: *перавоз**і**ць*; пішам: *перавоз**ч**ык*;<br>5) *мала**ць**біт* → азванчэнне зычнага гука [***ц’***] пры вымаўленні перад звонкім [***б’***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*мала**дз’**б’іт*]; правяраем: *мала**ц**іць*; пішам: *мала**ць**біт* | вымаўленне і правапіс.<br>Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | 2014; §§ 1, 2.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15,16 |
| **А8.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх выдзелены ***канчатак***:<br>1) позн***а***;<br>2) віта***юся***;<br>3) паклікал***а***;<br>4) пабудава***ўшы***;<br>5) прыгаж***осць***.<br><br>**Адказ:** 2,3 | 1) *позн**а*** → у прыслоўі выдзелены суфікс; прыслоўе – нязменная часціна мовы і не мае канчатка;<br>2) *віт**аю**ся* → у зваротным дзеяслове ў форме 1-й асобы адзіночнага ліку выдзелены канчатак (параўнайце: *віт**аеш**ся*, *віт**аем**ся*); ***-ся*** – постфікс;<br>3) *паклікал**а*** → у дзеяслове прошлага часу адзіночнага ліку жаночага роду выдзелены канчатак (параўнайце: *паклікал**і***);<br>4) *пабудава**ўшы*** → у дзеепрыслоўі выдзелены суфікс; дзеепрыслоўе – нязменная форма дзеяслова і не мае канчатка;<br>5) *прыгаж**осць*** → у назоўніку 3-га скланення ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку выдзелены суфікс (параўнайце: *прыгажосц**і***, *прыгажосц**ю***) | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Марфемы як структурна значымыя часткі слова | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 24–27.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 64, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 18, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25, 37, 38, 40, 43 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (форма) змяненне;<br>2) (тэхнік) механік; | 1) *формазмяненне* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***форм-*** і ***змяненн-*** з дапамогай злучальнай | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення. | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 3) (паў) Оршы;<br>4) (кілават) гадзі́на;<br>5) (аква) аэробіка.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | літары ***а***, пішацца разам;<br>2) *тэхнік-механік* → складаны назоўнік, утвораны ад двух самастойных слоў ***тэхнік*** і ***механік*** без злучальнай літары, пішацца праз злучок;<br>3) *паў-Оршы* → частка ***паў-*** з уласным назоўнікам пішацца праз злучок;<br>4) *кілават-гадзі́на* → складаны назоўнік са значэннем цэласнай адзінкі вымярэння пішацца праз злучок;<br>5) *аквааэробіка* → складаны назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***аква-*** пішацца разам | Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс | беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А10.** Адзначце прыклады, у якіх ад выдзеленых лічэбнікаў правільна ўтворана форма давальнага склону:<br>1) ***дзве*** – двум;<br>2) ***сто пяць*** – ста пяці;<br>3) ***паўтара*** – паўтарам;<br>4) ***трое*** – траім;<br>5) ***пяцьдзясят*** – пяцідзесяці.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) ***дзве*** – *дзвюм* → колькасны лічэбнік ***дзве*** ў форме давальнага склону мае канчатак ***-юм***;<br>2) ***сто пяць*** – *ста пяці* → у састаўным колькасным лічэбніку, які абазначае цэлы лік, пры скланенні змяняюцца абодва словы: лічэбнік ***сто*** ў давальным склоне мае форму *ст**а***, лічэбнік ***пяць*** змяняецца як назоўнік трэцяга скланення з асновай на мяккі зычны гук (*пяц**і** – радасц**і***);<br>3) ***паўтара*** – *паўтара* → колькасны дробавы лічэбнік, які ва ўсіх склонах мае толькі адну форму – ***паўтара***;<br>4) ***трое*** – *траім* → колькасны зборны лічэбнік скланяецца як прыметнік множнага ліку (*тра**ім** – сін**ім***);<br>5) ***пяцьдзясят*** – *пяцідзесяці* → у складаным колькасным лічэбніку абедзве часткі змяняюцца як назоўнікі трэцяга скланення з асновай на мяккі зычны гук (*пяц**і**дзесяц**і** – вернасц**і***) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 48, 49.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 34 |



УА РІКВ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А11.** Адзначце словы, якія пішуцца разам:<br>1) (фота) дакументальны;<br>2) (залата) струнны;<br>3) (бясконца) доўгі;<br>4) (двух) кілаграмовы;<br>5) (акцёрска) рэжысёрскі.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *фотадакументальны →* складаны прыметнік з першай іншамоўнай часткай ***фота-*** пішацца разам;<br>2) *залатаструнны →* складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***залатыя струны***), пішацца разам;<br>3) *бясконца доўгі →* прыслоўе і прыметнік, якія захоўваюць сваю лексічную самастойнасць (***доўгі бясконца***), пішуцца асобна;<br>4) *двухкілаграмовы →* складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***два кілаграмы***), пішацца разам;<br>5) *акцёрска-рэжысёрскі →* складаны прыметнік, утвораны ад двух раўназначных слоў (***акцёрскі*** і ***рэжысёрскі***), пішацца праз злучок | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс складаных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А12.** Адзначце прыклады, у якіх выдзелены дзеясловў правільна запісаны ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу:<br>1) ***прымусіць*** – прымусіш;<br>2) ***апранацца*** – апранешся;<br>3) ***нашаптаць*** – нашэпчаш;<br>4) ***запячы*** – запячэш;<br>5) ***узважыць*** – узважваеш.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) ***прымусіць*** – *прымусіш →* дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак ***-іш***;<br>2) ***апранацца*** – *апранаешся →* зваротны дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (*апрана[й̆э]шся*) мае канчатак ***-еш-***; ***-ся*** *– постфікс*;<br>3) ***нашаптаць*** – *нашэ́пчаш →* дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае не пад націскам канчатак ***-аш***;<br>4) ***запячы*** – *запячэ́ш →* дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае пад націскам канчатак ***-э́ш***;<br>5) ***узважыць*** – *узважыш →* дзеяслоў | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Трыванне дзеяслова. Утварэнне дзеясловаў закончанага і незакончанага трыванняў. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 61, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 320; § 38 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае канчатак **-ыш** | | |
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) ісці (***па***) ***малу***;<br>2) удаўся (***на***) ***славу***;<br>3) працавалі (***ў***) ***чацвярых***;<br>4) (***па***) ***гаспадарску*** даглядаць;<br>5) (***што***) ***ноч*** асвятляць.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *ісці* ***памалу*** → прыслоўе, утворанае ад прыметніка ***малы*** пры дапамозе прыстаўкі ***па-*** і суфікса ***-у***, пішацца разам;<br>2) *удаўся* ***на славу*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна;<br>3) *працавалі* ***ўчацвярых*** → прыслоўе, утворанае ад зборнага лічэбніка ***чацвёра*** пры дапамозе прыстаўкі ***у-*** (***ў-***) і суфікса ***-ых***, пішацца разам;<br>4) ***па-гаспадарску*** *даглядаць* → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на ***-ску***, пішацца праз злучок;<br>5) ***штоноч*** *асвятляць* → прыслоўе з першай часткай ***што-*** пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:<br>1) (***не***) ***накапа́лі*** бульбы;<br>2) (***не***) ***супынная*** плынь;<br>3) (***не***) ***наведаны*** музей;<br>4) ***(не) перадаўшы*** просьбы;<br>5) метады (***не***) ***апрабаваны***.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) ***не накапа́лі*** *бульбы* → ***не*** з дзеясловам пішацца асобна;<br>2) ***несупынная*** *плынь* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***несупынная*** не ўжываецца;<br>3) ***ненаведаны*** *музей* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежных слоў, пішацца разам;<br>4) ***не перадаўшы*** *просьбы* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>5) *метады* ***не апрабаваны*** → ***не*** з кароткім дзеепрыметнікам пішацца асобна; поўны дзеепрыметнік у форме множнага ліку будзе мець канчатак ***-ыя***: ***апрабаваныя*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 42, 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |



УАЦНКВ

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) ужываецца часціца ***ні***:<br>1) __ магу __ падзякаваць за вернасць вам, мае сябры.<br>2) За грошы шчасця __ купіш.<br>3) Увесь снежань __ сняжынкі.<br>4) Якіх толькі птушыных спеваў __ пачуеш у вясновым лесе!<br>5) Што б там __ гаварылі, паэты часцей у вёсках нараджаюцца.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) ***Не** магу **не** падзякаваць за вернасць вам, мае сябры.* → часціца ***не*** ўжываецца пры кожнай частцы састаўнога дзеяслоўнага выказніка і надае сказу сцвярджальны сэнс;<br>2) *За грошы шчасця **не** купіш.* → для надання адмоўнага значэння сказу пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>3) *Увесь снежань **ні** сняжынкі.* → для надання адмоўнага значэння сказу без дзейніка ўжываецца часціца ***ні***, якая стаіць пры дапаўненні – назоўніку ***сняжынкі*** ў форме роднага склону;<br>4) *Якіх толькі птушыных спеваў **не** пачуеш у вясновым лесе!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не***;<br>5) *Што б там **ні** гаварылі, паэты часцей у вёсках нараджаюцца.* → у даданай частцы складаназалежнага сказа для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні (спалучэнні слоў), якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) наведваць у свя́ты;<br>2) збегаць за малаком;<br>3) віднеліся карэнні;<br>4) дзівіцца з суседкі;<br>5) прыгожая подпіс.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *наведваць у свя́ты* → характэрнае для беларускай мовы словазлучэнне;<br>2) *збегаць па малако* → дзеяслоў руху ***збегаць*** мае мэтавае значэнне і спалучаецца з назоўнікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***па***;<br>3) *віднелася карэнне* → зборны назоўнік ***карэнне*** мае толькі форму адзіночнага ліку, і ў гэтай жа граматычнай форме да яго дапасуецца дзеяслоў ***віднелася***;<br>4) *дзівіцца з суседкі* → дзеяслоў ***дзівіцца*** патрабуе ад назоўніка формы роднага склону з прыназоўнікам ***з***;<br>5) *прыгожы подпіс* → назоўнік ***подпіс*** у беларускай мове адносіцца да мужчынскага роду, і ў гэтай жа граматычнай форме да яго дапасуецца прыметнік | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015;练практ. 96.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх правільна вызначаны ***выказнік***:<br>1) Верасень у апошнія гады ***<u>цёплы</u>***, ***<u>сухі</u>***.<br>2) Калега запрасіла ***<u>наведаць</u>*** мастацкі музей.<br>3) Без працы, ***<u>зразумела</u>***, і ні туды і ні сюды.<br>4) Я ***<u>буду</u>*** займацца ў гуртку юных тэхнікаў.<br>5) Сакавітыя, з мядовым пахам суніцы так і ***<u>просяцца</u>*** ў рот.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *Верасень у апошнія гады <u>цёплы</u>, <u>сухі</u>.* → састаўны іменны выказнік, у якім дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка); іменная частка выражана прыметнікамі ***цёплы*** і ***сухі*** (*верасень які ён ёсць?*);<br>2) *Калега запрасіла <u>наведаць</u> мастацкі музей.* → інфінітыў ***наведаць*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***запрасіла***, адказвае на пытанне *з якой мэтай?* і з'яўляецца акалічнасцю;<br>3) *Без працы, зразумела, <u>і ні туды і ні сюды</u>.* → слова ***зразумела*** – пабочнае, якое членам сказа не з'яўляецца; выказнік у сказе выражаны фразеалагізмам;<br>4) *Я <u>буду займацца</u> ў гуртку юных тэхнікаў.* → выказнік ***буду займацца*** мае складаную форму будучага часу;<br>5) *Сакавітыя, з мядовым пахам суніцы так і <u>просяцца</u> ў рот.* → выказнік ***просяцца*** выражаны дзеясловам | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Выказнік і спосабы яго выражэння | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 29, 54, 56, 64.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 3.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 17–19, 25, 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы:<br>1) Рэшткі вулканаў адшукалі пад Брагінам.<br>2) Ляці, бялюткі снег зімы, на дрэвы чорныя і на дамы.<br>3) Песні ў нас сардэчныя, шчырыя.<br>4) Без ветру і дуб не шуміць.<br>5) У жніўні надоўга задажджыла.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *Рэшткі вулканаў <u>адшукалі</u> пад Брагінам.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік ***адшукалі*** выражаны дзеясловам у форме прошлага часу множнага ліку;<br>2) *<u>Ляці</u>, бялюткі снег зімы, на дрэвы чорныя і на дамы.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма (развіты зваротак ***бялюткі снег зімы*** членам сказа не з'яўляецца); выказнік ***ляці*** выражаны дзеясловам загаднага ладу ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку;<br>3) *<u>Песні</u> ў нас <u>сардэчныя</u>, <u>шчырыя</u>.* → двухсастаўны сказ: дзейнік ***песні*** выражаны | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Двухсастаўныя сказы. Аднасастаўныя сказы, іх будова | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |

УА "РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | назоўнікам у форме назоўнага склону; у састаўным іменным выказніку дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка), іменная частка выражана прыметнікамі ***сардэчныя***, ***шчырыя***;<br>4) *Без ветру і дуб не шуміць.* → двухсастаўны сказ: дзейнік ***дуб*** выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; выказнік ***не шуміць*** – дзеясловам у форме 3-й асобы адзіночнага ліку;<br>5) *У жніўні надоўга задажджыла.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік ***задажджыла*** выражаны безасабовым дзеясловам | | |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Наша новая лазня __ хоць ваўкоў ганяй.<br>2) Беларусь __ мая маці і мова, паветра і хлеб.<br>3) Дуброва __ не дуброва, калі ў ёй птушкі не шчабечуць.<br>4) Восеньскі бярозавы лісток __ нібы залатая манетка.<br>5) Калядная ёлка, безумоўна, __ самы важны святочны атрыбут.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *Наша новая лазня* **–** *хоць ваўкоў ганяй.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>2) *Беларусь* **–** *мая маці і мова, паветра і хлеб.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Дуброва не дуброва, калі ў ёй птушкі не шчабечуць.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць адмоўная часціца ***не***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>4) *Восеньскі бярозавы лісток нібы залатая манетка.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць параўнальны злучнік ***нібы***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>5) *Калядная ёлка, безумоўна, самы важны святочны атрыбут.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, стаіць пабочнае слова ***безумоўна***, таму працяжнік ***не*** | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ***ставіцца*** | | |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Апранулі вербы доўгія__ зялёныя сарафаны і любуюцца сабою ў жамчужна-блакітнай вадзе.<br>2) Былое, сучаснае__ ды наступнае цесна пераплецены, няма паміж імі дакладнай мяжы.<br>3) Музей беларускага кнігадрукавання, Сафійскі сабор, геаграфічны цэнтр Еўропы__ ўсё гэта мой родны Полацк.<br>4) Спрадвечныя дубы вабяць спакоем__ і сілай, і вышынёй.<br>5) Не гарачым летам__ а лагоднай восенню люблю я адпачываць на моры.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *Апранулі вербы доўгія зялёныя сарафаны і любуюцца сабою ў жамчужна-блакітнай вадзе.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якаснымі прыметнікамі ***доўгія*** і ***зялёныя***, якія характарызуюць прадмет з розных бакоў, коска не ставіцца;<br>2) *Былое, сучаснае ды наступнае цесна пераплецены, няма паміж імі дакладнай мяжы.* → паміж аднароднымі дзейнікамі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (=***і***), коска не ставіцца;<br>3) *Музей беларускага кнігадрукавання, Сафійскі сабор, геаграфічны цэнтр Еўропы* **–** *усё гэта мой родны Полацк.* → функцыю абагульняльнага слова выконвае словазлучэнне ***усё гэта***, перад якім пасля аднародных дзейнікаў ***Музей беларускага кнігадрукавання***, ***Сафійскі сабор***, ***цэнтр*** ставіцца працяжнік;<br>4) *Спрадвечныя дубы вабяць спакоем****,*** *і сілай, і вышынёй.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя дапаўненні, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>5) *Не гарачым летам****,*** *а лагоднай восенню люблю я адпачываць на моры.* → паміж аднароднымі акалічнасцямі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка, ставіцца коска | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.<br>Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 19, 20.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) У вуснай паэтычнай творчасці беларусаў ліпа падаецца__ як сімвал дабрабыту і жаноцкасці.<br>2) Калі пад страхой спрасонку ціўкнуў верабей, на яго «ціўк»__ як бач__ адклікнуўся малады певень.<br>3) На зямлі гаспадарыла залаціста-жоўтая__ | 1) *У вуснай паэтычнай творчасці беларусаў ліпа падаецца як сімвал дабрабыту і жаноцкасці.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як сімвал дабрабыту і жаноцкасці***, які мае значэнне 'ў якасці' (*ліпа* і ёсць *сімвал дабрабыту і жаноцкасці*);<br>2) *Калі пад страхой спрасонку ціўкнуў верабей, на яго «ціўк» як бач адклікнуўся* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.<br>Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| быццам бурштын__ восень.<br>4) Нібы дзеці__ плачуць у небе гусі, доўга будуць крыкі іх чуваць, над лясамі роднай Беларусі зноў дажджы грыбныя шалясцяць.<br>5) Мова родная, ты кожным сваім словам саграваеш ласкава__ што сонейка.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | *малады певень.* → не выдзяляецца коскамі фразеалагізм ***як бач***;<br>3) *На зямлі гаспадарыла залацíста-жоўтая**,** быццам бурштын**,** восень.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***быццам бурштын***; ***быццам*** – параўнальны злучнік;<br>4) *Нібы дзеці**,** плачуць у небе гусі, доўга будуць крыкі іх чуваць, над лясамі роднай Беларусі зноў дажджы грыбныя шалясцяць.* → аддзяляецца коскай параўнальны зварот ***нібы дзеці***; ***нібы*** – параўнальны злучнік;<br>5) *Мова родная, ты кожным сваім словам саграваеш ласкава**,** што сонейка.* → аддзяляецца коскай параўнальны зварот ***што сонейка***; ***што*** – параўнальны злучнік | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Люблю ў кастрычніку па маўклівай алеі прайсці__ не спяшаючыся.<br>2) Апрача бярозавіку__ смагу добра наталяе хлебны квас.<br>3) Велічна ляціць__ выцягнуўшы наперад сваю гнуткую шыю__ беласнежны лебедзь.<br>4) Свабодны верш__ ці інакш верлібр__ асабліва быў папулярны ў XX стагоддзі.<br>5) Роўненька ляжалі ў дупле__ сабраныя вавёркай__ грыбы.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *Люблю ў кастрычніку па маўклівай алеі прайсці не спяшаючыся.* → коскай не аддзяляецца выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць ***не спяшаючыся***, якая стаіць у канцы сказа і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння (адказвае на пытанне *як?*);<br>2) *Апрача бярозавіку**,** смагу добра наталяе хлебны квас.* → аддзяляецца коскай адасобленае дапаўненне ***Апрача бярозавіку***, выражанае назоўнікам у форме роднага склону з прыназоўнікам ***апрача***;<br>3) *Велічна ляціць**,** выцягнуўшы наперад сваю гнуткую шыю**,** беласнежны лебедзь.* → выдзяляецца коскамі адасобленая акалічнасць ***выцягнуўшы наперад сваю гнуткую шыю***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>4) *Свабодны верш**,** ці інакш верлібр**,** асабліва быў папулярны ў XX стагоддзі.* → выдзяляецца коскамі адасоблены прыдатак ***ці інакш верлібр***, пры якім ёсць злучнік ***ці*** і які мае ўдакладняльнае значэнне; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *Роўненька ляжалі ў дупле сабраныя вавёркай грыбы.* → не выдзяляецца коскамі дапасаванае азначэнне ***сабраныя вавёркай***, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам, бо стаіць перад паяснёным назоўнікам ***грыбы*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі | | |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы), што трэба выдзеліць (аддзяліць) коскамі (коскай):<br>1) Натрудзіў дзяцел дзюбу, збудаваў сабе хатку і нават не паспеў у ёй абжыцца, як з'явілася кватарантка – сава-драпежніца.<br>2) Кніга на мой погляд на ўсе часы застанецца найвялікшым адкрыццём.<br>3) З адкладу вядома няма ладу.<br>4) На свеце шмат розных мясцін, аднак у кожнага з нас ёсць такія, з якімі мы звязаны на ўсё жыццё.<br>5) Новая ясёнка так у нашай мясцовасці называюць асенняе паліто была мне вельмі да твару.<br><br>**Адказ:** 2,3 | 1) *Натрудзіў дзяцел дзюбу, збудаваў сабе хатку і нават не паспеў у ёй абжыцца, як з'явілася кватарантка – сава-драпежніца.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; узмацняльная часціца ***нават*** у ролі пабочнага слова не выступае і коскамі не выдзяляецца;<br>2) *Кніга**,** на мой погляд**,** на ўсе часы застанецца найвялікшым адкрыццём.* → у сказе ёсць пабочнае словазлучэнне ***на мой погляд***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не выконвае ролі члена сказа, указвае на крыніцу паведамлення і выдзяляецца коскамі;<br>3) *З адкладу**,** вядома**,** няма ладу.* → у сказе ёсць пабочнае слова ***вядома***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не выконвае ролі члена сказа і ўказвае на большую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным і выдзяляецца коскамі;<br>4) *На свеце шмат розных мясцін, аднак у кожнага з нас ёсць такія, з якімі мы звязаны на ўсё жыццё.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; ***аднак*** – супраціўны злучнік, які звязвае дзве сэнсавыя часткі складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак;<br>5) *Новая ясёнка (так у нашай мясцовасці называюць асенняе паліто) была мне вельмі да твару.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; устаўная канструкцыя ***так у*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ***нашай мясцовасці называюць асенняе паліто***, якая па сэнсе не звязана з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, бярэцца ў дужкі або выдзяляецца працяжнікамі | | |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Да восені 1917 года праца над «Беларускай граматыкай для школ» Браніславам Тарашкевічам была скончана__ а напярэдадні навучальнага 1918 года яе ўжо атрымалі школы.<br>2) Зачапіўся ветрык за галінку__ і расы́ як не было.<br>3) За нашай рэчкаю стаяць чатыры сценкі бору__ і з вёскі ўсім нам люба пазіраць на гэты светлы хорам.<br>4) Шум дажджу__ і ветру гул.<br>5) Няхай жыта, п'ючы расу́, падрастае__ і сіненькія васількі яго аздабляюць.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *Да восені 1917 года праца над «Беларускай граматыкай для школ» Браніславам Тарашкевічам была скончана****,*** *а напярэдадні навучальнага 1918 года яе ўжо атрымалі школы.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** ставіцца коска;<br>2) *Зачапіўся ветрык за галінку* ***–*** *і расы́ як не было.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік;<br>3) *За нашай рэчкаю стаяць чатыры сценкі бору****,*** *і з вёскі ўсім нам люба пазіраць на гэты светлы хорам.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>4) *Шум дажджу і ветру гул.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія з'яўляюцца назыўнымі сказамі, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца;<br>5) *Няхай жыта, п'ючы расу́, падрастае і сіненькія васількі яго аздабляюць.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак часціца ***няхай*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) ***не трэба*** ставіць знак (знакі) прыпынку: | 1) *Стажком здавалася елка****,*** *ніжнія лапкі якой густа слаліся па зямлі.* → у складаназалежным сказе дадзеная частка, | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) Стажком здавалася елка__ ніжнія лапкі якой густа слаліся па зямлі.<br>2) Снег__ які ішоў з самага ранку__ зрабіў казачнымі вясковыя сады.<br>3) Некалі народ заўважыў, што__ калі люты марозны, то лета будзе гарачае.<br>4) У 1914 годзе Канстанцыя Буйло выдала свой дэбютны зборнік «Курганная кветка», які быў адрэдагаваны Янкам Купалам__ і які аформіў Язэп Драздовіч.<br>5) Дзе сасна расце высокая па-над рэчкай гаманліваю__ бусел радуе нас клёкатам, прыляцеўшы з далёкага выраю.<br><br>**Адказ:** 3,4 | што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***якой***, аддзяляецца коскай;<br>2) *Снег**,** які ішоў з самага ранку**,** зрабіў казачнымі вясковыя сады.* → у складаназалежным сказе даданая частка, што стаіць у сярэдзіне галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***які***, выдзяляецца коскамі;<br>3) *Некалі народ заўважыў, што калі люты марозны, то лета будзе гарачае.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коску ставіць ***не трэба***, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то***;<br>4) *У 1914 годзе Канстанцыя Буйло выдала свой дэбютны зборнік «Курганная кветка», які быў адрэдагаваны Янкам Купалам і які аформіў Язэп Драздовіч.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай дапаўненне ***зборнік***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *які?* і з'яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць ***не трэба***;<br>5) *Дзе сасна расце высокая па-над рэчкай гаманліваю**,** бусел радуе нас клёкатам, прыляцеўшы з далёкага выраю.* → у складаназалежным сказе даданая частка, якая стаіць перад галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***дзе***, аддзяляецца коскай | Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е:<br>1) Гардзей ледзь не адстаў ад цягніка__ на | 1) *Гардзей ледзь не адстаў ад цягніка**:** на пероне прадавалі яблыкі, грушы, вішні.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| пероне прадавалі яблыкі, грушы, вішні.<br>2) Уважліва прыглядаюся да руплівых пчолак і разумею__ нектар яны збіраюць з самых духмяных кветак.<br>3) Будзе час__ будзе і квас.<br>4) Засвяціў у небе вячэрнім двухрогі маладзічок__ бадае рожкамі ён тонкімі хмурынку пад бачок.<br>5) Усім вядома__ гасцінны ў нашым краі кожны дом.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>2) *Уважліва прыглядаюся да руплівых пчолак і разумею**:** нектар яны збіраюць з самых духмяных кветак.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка дапаўняе першую, развіваючы дзеяслоў-выказнік ***разумею***; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>3) *Будзе час **–** будзе і квас.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой частцы; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі***;<br>4) *Засвяціў у небе вячэрнім двухрогі маладзічок**,** бадае рожкамі ён тонкімі хмурынку пад бачок.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны паслядоўнасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (=***і***);<br>5) *Усім вядома**:** гасцінны ў нашым краі кожны дом.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што*** | Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |
| **А27.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак:<br><br>*Сёння, прачнуўшыся раненька, Янка спяшаецца ў кузню моманту калі дзед бярэ ў рукі кувалду і калі з гнуткага жалеза пачынаюць плесціся незвычайныя ўзоры ён не жадае прапусціць.* | **I** [1]*Сёння, прачнуўшыся раненька, Янка спяшаецца ў кузню**:*** **II** [2]*моманту**,*** [3]*калі дзед бярэ ў рукі кувалду і* [4]*калі з гнуткага жалеза пачынаюць плесціся незвычайныя ўзоры**,*** [2]*ён не жадае прапусціць.* → складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак адпавядаюць наступныя сцверджанні: | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа |

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| 1) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку;<br>2) у сказе прапушчана двукроп’е;<br>3) у сказе прапушчаны тры коскі;<br>4) у сказе прапушчаны дзве коскі;<br>5) у сказе прапушчаны працяжнік.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) сцверджанне пад нумарам **2**: паміж **I** і **II** сэнсавымі часткамі ставіцца двукроп’е, бо яны звязаны бяззлучнікавай сувяззю і ў **II** частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў **I**; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>2) сцверджанне пад нумарам **4**: у **II** сэнсавай частцы аднародныя даданыя часткі **3** і **4**, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай **2**, выдзяляюцца з двух бакоў коскамі.<br>Паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца | сувязі частак | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А28.** Адзначце знак (знакі) прыпынку, які (якія) трэба паставіць на месцы пропуску ў сказе:<br>*«Што ні кажы, брат, а трэба час ад часу акунацца ў мінулае, як у жывую ваду, – заўважыў мой субяседнік__ Толькі пры гэтай умове не забудзеш, хто ты і адкуль».*<br><br>1) коску;<br>2) коску і працяжнік;<br>3) кропку і працяжнік;<br>4) двукроп’е і працяжнік;<br>5) двукроп’е.<br><br>**Адказ:** 3 | *«Што ні кажы, брат, а трэба час ад часу акунацца ў мінулае, як у жывую ваду, – заўважыў мой субяседнік*. **–** *Толькі пры гэтай умове не забудзеш, хто ты і адкуль».* → сказ з простай мовай, у якім:<br>1) словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, падзяляючы яе на дзве самастойныя часткі (два апавядальныя сказы); пасля слоў аўтара трэба паставіць *кропку* і *працяжнік* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6** (1) *Алесь ішоў высокім берагам яшчэ соннага возера.* (2) *Белы пясок каля вады быў затканы зялёнымі верасамі.* (3) *Месцамі, ахапіўшы вузлаватымі каранямі зямлю, стаялі дубы-волаты.* (4) *Магутныя і велічныя постаці іх адбіваліся ў люстра́най вадзе.* (5) *Узыходзіла сонца.* (6) ***<u>Вялікі</u>*** *пунсовы шар імкліва каціўся насустрач адзінокай ранішняй хмарцы, якая, нібы спалохаўшыся, хутка спусцілася за далягляд і застыла там у полымі ўсходу.* (7) *Малюнкі прыроды мяняліся адзін за адным.* (8) *Зусім нядаўна Алесь з захапленнем любаваўся магутнымі дубамі і* ***<u>самім</u>*** *абрывістым берагам, але нечакана дарожка, нібыта белая ручаінка, пакацілася ўніз.* (9) *І вось ужо перад вачыма раскінулася бязмежная сенажаць, якая нагадвала разасланы дыван, што зліваўся ўдалечыні з блакітным шоўкам летняга неба.* (10) *На гэтай напоўненай святлом раздольнай мясціне віднеліся асобныя купкі беланогіх бярозак, якія стаялі дзіўна, быццам дзяўчаты ў карагодзе.* (11) *У самай нізіне дарожку перабягаў невялікі ручай.* (12) *Цурчэў маленькі* ***<u>ручай</u>*** *то звонка, весела, то ледзь пачуеш яго.* (13) *А вада ў ім была такая чыстая, што круглыя каменьчыкі на дне здаваліся белымі кара́лямі.* (14) *Алесю не хацелася піць, але ён дастаў з рукзака* ***<u>кубак</u>****, зачэрпнуў вады і зрабіў адзін, другі глыток, а затым выпіў увесь кубак.* (15) *«Смачнейшай вады за тваю, ручаёк, – сказаў услых Алесь, – я ніколі ў жыцці не піў».* (16) *Хлопец выцер далонню губы, абтрос з кашулі празрыстыя кропелькі і, шчаслівы, вырашыў* ***<u>прадоўжыць</u>*** *сваё падарожжа.* | | | |
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>2) тэкст афіцыйнага стылю;<br>3) тэкст навуковага стылю;<br>4) тэкст гутарковага стылю;<br>5) тэкст мастацкага стылю.<br><br>**Адказ:** 5 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **5**: тэкст ***мастацкага стылю***, таму што:<br>1) уяўляе сабой свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне, якое характэрна для мастацкіх твораў розных жанраў: *раман*, *аповесць*, *апавяданне*;<br>2) яго галоўная асаблівасць – адзінства рэалізацыі камунікатыўнай і эстэтычнай функцый: словы не толькі перадаюць пэўны змест, але і, з'яўляючыся сродкам фарміравання мастацкіх вобразаў, уздзейнічаюць на думкі і пачуцці чытача;<br>3) эмацыянальнасць, вобразнасць, яркасць тэксту надаюць вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэты (*соннага возера*, *вузлаватымі каранямі*, *у люстра́най вадзе*, *беланогіх бярозак*); метафары (*пясок быў затканы зялёнымі верасамі*, *дарожка пакацілася*); параўнанні (*дарожка, нібыта белая ручаінка*; *стаялі дзіўна, быццам дзяўчаты ў карагодзе*); словы з памяншальна-ласкальным значэннем (*хмарцы*, *дарожка*, *ручаінка*, *купкі, бярозак*, *каменьчыкі*, *ручаёк*); сказ з простай мовай | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | («*Смачнейшай вады за тваю, ручаёк, – сказаў услых Алесь, – я ніколі ў жыцці не піў*».) і іншыя моўныя сродкі, характэрныя для тэкстаў мастацкага стылю | | Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** Адзначце сцверджанне, якое ***поўнасцю*** адпавядае слову, падкрэсленаму ў ***12-м*** сказе тэксту:<br>1) лексічны паўтор, які з'яўляецца ***не адзіным*** сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м;<br>2) лексічны паўтор, які з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м;<br>3) сінонім, які з'яўляецца ***не адзіным*** сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м;<br>4) сінонім, які з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м;<br>5) прыслоўе, якое з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м.<br><br>**Адказ:** 1 | слову, падкрэсленаму ў ***12-м*** сказе тэксту, ***поўнасцю*** адпавядае сцверджанне пад нумарам **1**:<br>1) сродкам сувязі 12-га сказа з 11-м з'яўляецца лексічны паўтор ***ручай***; лексічны паўтор ***ручай*** не адзіны сродак сувязі: сродкамі сувязі 12-га сказа з 11-м з'яўляюцца таксама сінонім ***маленькі***, аднолькавая форма часу дзеясловаў ***перабягаў, цурчэў*** (дзеясловы ўжыты ў форме прошлага часу) | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***12-м*** сказе тэксту слова, у якім ёсць гук [**ц'**]. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***12-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** ледзь | 1) *ледзь* → звонкі зычны гук [***дз'***] на канцы слова аглушаецца і вымаўляецца як глухі зычны [**ц'**]: [*л'эц'*];<br>2) у слове *цурчэў* – гук [**ц**]: [***ц****урчэў*] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **В2.** Утварыце і запішыце простую форму вышэйшай ступені параўнання прыметніка, падкрэсленага ў ***6-м*** сказе тэксту.<br><br>**Адказ:** большы | 1) *большы* → простая форма вышэйшай ступені параўнання прыметніка ***вялікі*** утвараецца пры дапамозе суфікса -***ш***-;<br>2) зыходны прыметнік ***вялікі*** і простая форма вышэйшай ступені параўнання ***большы*** маюць розныя асновы | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 31 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***14-м*** сказе тэксту назоўнік у форме роднага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** кубка | 1) *кубка* → канкрэтны назоўнік 2-га скланення мужчынскага роду з асновай на зычны гук [***к***] у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак -***а*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 10, 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 27, 29 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***8-м*** сказе тэксту займеннік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** сам | 1) *сам* → азначальны займеннік ***самім*** у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мае нулявы канчатак | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 53 |
| **В5.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***16-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** прадоўжаны | 1) ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***прадоўжыць*** з дапамогай суфікса -***ан***- утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу ***прадоўжаны***; форма назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду – ***прадоўжаны*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8, 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td>В6. У адным са сказаў 5–9 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘стаць нерухомым’. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў адным са сказаў 5–9.<br><br>Адказ: застыла</td><td>1) лексічнае значэнне ‘стаць нерухомым’ мае слова застыць;<br>2) ужытае ў 6-м сказе тэксту слова застыць мае граматычную форму застыла</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20</td></tr>
<tr><td>В7. Знайдзіце ў прапанаваным сказе слова, пры ўжыванні якога парушана марфалагічная норма. Запішыце гэта слова ў патрэбнай граматычнай форме:<br><br>Асенняе поле жыло ўжо іншым настроем: напоўнена было яно боллю і сумам шчымлівым па жыце каласістым, якое сцяною стаяла калісьці.<br><br>Адказ: болем</td><td>1) у сказе парушана марфалагічная норма пры ўжыванні назоўніка боль у форме творнага склону адзіночнага ліку: правільная граматычная форма назоўніка боль, які ў беларускай мове адносіцца да мужчынскага роду, – болем</td><td>Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 14.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 28; практ. 248</td></tr>
<tr><td colspan="4">В8. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж падкрэсленымі фразеалагізмамі ў левым і правым слупках. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>
<table>
<tr><td>А. Я колькі было сілы крыкнуў, але ў адказ пачуў ціхае рэха.<br>Б. Даўно і ўсёй душой люблю цябе, Нарач.<br>В. Дранікаў на талерцы было еш не хачу.<br>Г. Ад усяго сэрца віншавалі настаўнікі сваіх выпускнікоў.</td><td>1. За вясельным сталом страў розных колькі душа пажадае.<br>2. Усім сэрцам прыкіпеў я да школы, дзе працую ўжо трыццаць гадоў.<br>3. Словы ў адрас юбіляра гучалі ад чыстага сэрца.<br>4. Бацькі мае жывуць усё жыццё душа ў душу.<br>5. «Унучак, выглянi ў акенца!» – гукнуў на ўсю моц дзядуля.</td></tr>
</table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А5Б2В1Г3</td><td>1) фразеалагізм колькі было сілы адпавядае па сэнсе фразеалагізму на ўсю моц;</td><td>Лексіка. Фразеалогія.</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | фразеалагізмы маюць значэнне ‘*вельмі гучна, голасна, моцна*’;<br>2) фразеалагізм ***усёй душой*** адпавядае па сэнсе фразеалагізму ***ўсім сэрцам***; фразеалагізмы маюць значэнне ‘*шчыра, сардэчна* (*любіць, кахаць, верыць*)’;<br>3) фразеалагізм ***еш не хачу*** адпавядае па сэнсе фразеалагізму ***колькі душа пажадае***; фразеалагізмы маюць значэнне ‘*ўволю, удосталь, без усякага абмежавання*’;<br>4) фразеалагізм ***ад усяго сэрца*** адпавядае па сэнсе фразеалагізму ***ад чыстага сэрца***; фразеалагізмы маюць значэнне ‘*з усёй шчырасцю, адкрытасцю*’ | Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22 |

**В9.** Вызначце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца падкрэсленыя ў сказах словы, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ***<u>Уздоўж</u>*** сцішанай рэчкі месячык выткаў срэбныя сцежкі.<br>**Б.** На галінцы, ***<u>што</u>*** навісла над ракой, я ўбачыў зімародка.<br>**В.** У чэрвені было дажджліва і холадна, ***<u>затое</u>*** ліпень парадаваў сонейкам і цяплом.<br>**Г.** Хутка ранак, а мне ўсё не спіцца, ля акна, зачараваны, стаю: прыляцеў салавей ***<u>і</u>*** ў сталіцу, ён душу распагодзіў маю. | **1.** Прыназоўнік.<br>**2.** Злучнік.<br>**3.** Займеннік.<br>**4.** Прыслоўе.<br>**5.** Часціца. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А1Б3В2Г5 | 1) *уздоўж* → ***вытворны прыназоўнік***, які паходзіць ад прыслоўя ***ўздоўж*** і выражае прасторавыя адносіны;<br>2) *што* → ***адносны займеннік***, які з’яўляецца злучальным словам (звязвае галоўную і даданую часткі складаназалежнага сказа); у сказе выконвае сінтаксічную ролю дзейніка;<br>3) *затое* → ***злучальны злучнік***, які звязвае дзве часткі складаназлучанага сказа;<br>4) *і* → ***узмацняльная часціца***, якая ўжываецца для ўзмацнення сэнсу слова (*у*) ***сталіцу*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Самастойныя і службовыя часціны мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 20, 21, 35, 41, 43, 44.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>Н.М. Гардзей і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 7, 9, 14, 15.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 35, 41, 44, 45</td></tr>
<tr><td colspan="4">В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br><table><tr><td>А. Загад.<br>Б. Абнавіць.<br>В. Зацікаўленасць.<br>Г. Спецкар.</td><td>1. Прыставачны.<br>2. Суфіксальны.<br>3. Абрэвіяцыя.<br>4. Бяссуфіксны.<br>5. Прыставачна-суфіксальны.</td></tr></table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А4Б5В2Г3</td><td>1) загад → слова ўтворана бяссуфіксным спосабам: загад/а/-(ць) + Ø (нулявы суфікс);<br>2) абнавіць → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: нов-(ы) + прыстаўка аб- і суфікс -і-;<br>3) зацікаўленасць → слова ўтворана суфіксальным спосабам: зацікаўлен-(ы) + суфікс -асць-;<br>4) спецкар → спосаб утварэння – абрэвіяцыя: складанаскарочанае слова (абрэвіятура), утворанае шляхам спалучэння частак слоў <u>спец</u>ыяльны і <u>кар</u>эспандэнт</td><td>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32, 34.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 70.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25</td></tr>
</table>